# КРОК НАСУСТРАЧ

## У ТРЭЦІ ДЗЕНЬ АЛІМПІЯДЫ НАШЫ СУАЙЧЫННІКІ БЫЛІ БЛІЗКІЯ ДА П'ЕДЭСТАЛА

✓ Стралок Ілья Чаргейка заняў 6-е месца ў фінальных спаборніцтвах па стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі на дыстанцыі 10 м. Вынік беларуса ў фінале — 121,6 ачка. Ён скончыў барацьбу за медалі пасля пятага выстралу.



— Вядома, паспехам 6-е месца ў фінале назваць не паварочваецца язык, — кажа Ілья. — На вырашальнай стадыі спаборніцтваў заўсёды хочацца выйграць. Але фінал — гэта такая справа, што прадказаць штосьці цяжка.

У кар'еры Чаргейкі гэта ўжо другая Алімпіяда, на Гульнях у Лондане ён таксама выступаў у фінале і стаў сёмым. Сёлета спартсмен заваяваў срэбныя медалі чэмпіянату Еўропы ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі на дыстанцыі 10 м у камандным і асабістым першынствах.

Яшчэ адзін беларус, Віталь Бубновіч, на жаль, не змог прабіцца ў фінал. У кваліфікацыі ён паказаў толькі 17-ы вынік (622,9 ачка).

✓ У нашай зборнай па цяжкай атлетыцы адбылася замена. Станіслава Чадовіча, які мусіў выступіць у катэгорыі да 62 кг, замяніў цяжкавагавік Аляксей Мжачык. Аб прычынах перастановак не паведамляецца.

Нагадаем, беларускія цяжкаатлеты на Гульнях у Рыа прадстаўлены васьмю спартсменамі, сярод іх чэмпіёны свету — Вадзім Стральцоў (да 94 кг) і Дар'я Навумава (да 75 кг).

Першыя прадстаўнікі нашай краіны выйдуць на памост ужо сёння — у вагавой катэгорыі да 69 кг выступяць Анастасія Міхаленка і Дар'я Пачобут.

✓ Вікторыя Паўловіч завяршыла выступленне на алімпійскім турніры па настольным тэнісе. У паядынку трэцяга кваліфікацыйнага раўнда беларуска саступіла 10-й ракетцы свету Чэн І-Чын (кітайскі Тайбэй).

# САМЫЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ

**Будысцкі манах, эстонскія трайняты і 62-гадовая спартсменка. Мы раскажам пра людзей, якія прыехалі ў Бразілію не толькі перамагаць, але і здзіўляць.**

### Каласальны вопыт

Найстарэйшай удзельніцай Алімпіяды ў Рыа-дэ-Жанэйра стала новазеландка Джулія Броўкхэм, якая выступае ў конным спорце. Ёй 62 гады, лічба, вядома, не малая, але для гэтага віду спорту цалкам прымальная.

Іншая справа — спартыўная гімнастыка, дзе дзяўчаты ў 25 гадоў ужо лічацца ветэранамі і заканчваюць сваю кар'еру. Але не ўсе. Аксана Чусавіціна са зборнай Узбекістана не прапускае летнія Алімпійскія гульні з 1992 года. Зараз ёй 41. Сваю апошнюю ўзнагароду на Алімпіядзе гімнастка заваявала ў 2008 годзе ў Пекіне, заняўшы трэцяе месца ў апорным скачку.

### Калі адзін у полі воін

Самай маленькай камандай на Алімпіядзе ў Рыа стала зборная Тувалу. Яе прадстаўляе ўсяго адзін спартсмен — Эцімоні Цімуані. Ён з'яўляецца чэмпіёнам краіны па футболе і нават згуляў 5 матчаў за нацыянальную каманду. Футбалісты Тувалу не змаглі кваліфікавацца на Алімпіяду-2016, таму Эцімоні выступіць у ролі лёгкаатлета. Ён спецыялізуецца ў бегу на 100 метраў.



### Эстонскія трайняты

Сёстры Луйк — першыя ў гісторыі трайняты-ўдзельніцы Алімпіяды. У Рыа Лэйлу, Ліину і Лілі мы зможам убачыць у марафоне. Дыстанцыю яны збіраюцца завяршыць разам, адначасова ўстанавіўшы асабістыя рэкорды.

Нагадаем, жаночы забег адбудзецца 14 жніўня.



### Людзі з жалезным характарам

Адразу дзве паралімпійскія спартсменкі выступаюць у спаборніцтвах па настольным тэнісе — Наталля Партыка з Польшчы і аўстралійка Меліса Тэпер. Для Партыкі, якая нарадзілася без правай рукі і перадплечча, гэтая Алімпіяда — трэцяя ў кар'еры. Раней яна выступала на Гульнях у Пекіне і Лондане, але пакуль сур'ёзнага поспеху не дасягала. Затое на Паралімпіядах заваявала тры залатыя медалі.

Аўстралійская спартсменка Меліса Тэпер упершыню прымае ўдзел у Алімпіядзе. Дзяўчына нарадзілася з пашкоджаннем нерва правай рукі, але гэта не перашкодзіла ёй стаць адной з вядучых тэнісістак у сваёй краіне.

Абедзве дзяўчыны спадзяюцца даказаць іншым спартсменам-паралімпійцам, што няма нічога немагчымага.

### Сямейная пара ў адной камандзе

Гульцы жаночай зборнай Вялікабрытаніі па хакеі на траве Кейт Уолш і Хелен Рычардсан выступаюць у адной камандзе трэція Гульні запар, але сёлета ўпершыню прымуць удзел у якасці шлюбнай пары. Дзяўчаты гуляюць разам яшчэ са студэнцтва, але доўгі час былі проста сяброўкамі. У 2008-м Кейт парвала адносіны з капітанам мужчынскай зборнай Вялікабрытаніі Брэтам Герардам, пасля чаго яе раман з Хелен стаў імкліва развівацца. У Рыа яны будуць гуляць пад агульным прозвішчам Рычардсан-Уолш.

### Будысцкі манах

Японец Кадзукі Ядзава — лідар сваёй зборнай па веславанні на байдарках і каноэ, сёлетняя Алімпіяда — трэцяя ў яго кар'еры. У Лондане ён заняў дзявятае месца, гэта найлепшы вынік краіны за ўсю гісторыю выступлення ў спаборніцтвах па веславанні. Аднак пасля такога поспеху на радзіме ён так і не стаў папулярным і доўга не мог знайсці спонсараў, таму вырашыў уладкавацца на пастаянную працу — у будысцкі храм.



Дарэчы, прэзідэнт федэрацыі каноэ прэфектуры Нагана таксама з'яўляецца манахам. Ядзава з галавой акунуўся ў рэлігію. Цяпер ён трэніруецца толькі ў вольны час — па паўтары гадзіны на дзень, шэсць разоў на тыдзень. Такі лаяльны графік не перашкодзіў яму адабрацца на Алімпіяду-2016. Ядзава верыць, што заваяваць медаль у Рыа яму дапаможа духоўная і ментальная сіла.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

***Першы ўраджай фасолі паспявае ў канцы чэрвеня, а збор працягваецца да сярэдзіны, а то і да канца верасня.***

## СПАРЖАВАЯ ФАСОЛЯ

***Спаржавая фасоля адрозніваецца ад звычайнай тым, што ў ежу ўжываецца не насенне, а зялёныя стручкі, у якіх насенне яшчэ не дасягнула нават малочнай спеласці.***

Перш за ўсё варта мець на ўвазе, што гатункі спаржавай фасолі дзеляцца на спаржавыя і паўспаржавыя. Першыя характарызуюцца круглым у сячэнні стручком з вялікай колькасцю жэле. У другіх стручок плоскі і жэле значна менш. Гэтыя сарты прыдатныя як для ўжывання стручкоў, так і для насення. Зрэшты, як усе ўніверсалы, канкурэнцыі з праўдзіва спаржавымі гатункамі яны не вытрымліваюць, і ўвагі вартыя толькі некаторыя павойныя гатункі.

Агратэхніка вырошчвання стручковай фасолі падобная да агратэхнікі для звычайнай фасолі, аднак ёсць і адрозненні. Перш за ўсё, у спаржавай фасолі вельмі расцягнуты перыяд збору ўраджаю, таму градкі варта планаваць так, каб забяспечыць да іх зручны доступ. Ужо праз 40—50 дзён ад пасеву фасолі пачынаецца збор стручкоў. Тут галоўнае — не празяваць. Як толькі стручкі дасягаюць





памеру ў 10—12 см, іх трэба здымаць. Калі насенне ў іх паспела сфарміравацца, такія стручкі ўжо мала прыдатныя для выкарыстання. Уборку праводзяць рэгулярна, адзін раз у тры-чатыры дні. Не варта пакідаць на кустах пераспелыя стручкі, бо гэта затрымлівае ўтварэнне новых. Як правіла, першы ўраджай фасолі паспявае ў канцы чэрвеня, а збор працягваецца да сярэдзіны, а то і да канца верасня.

Асаблівую ўвагу неабходна надаць раслінам, прызначаным на насенне. Іх высейваюць адразу пасля знікнення рызыкі замаразкаў, як мага раней. Зялёныя стручкі з гэтых раслін не збіраюць, паколькі другі ўраджай ужо не паспее выспець. Сабранае насенне можна ссыпаць у пластыкавыя бутэлькі і захоўваць у халадзільніку.

Кудравыя паўспаржавыя гатункі можна выкарыстоўваць для зацянення градак там, дзе гэта неабходна. Для зацянення трэба нацягнуць сетку для гародніны і пасеяць уздоўж яе фасолю — і ўжо ў сярэдзіне лета ўтворыцца паўцень, пажаданы, напрыклад, для зяленіва ці агуркоў.

Стручкі спаржавай фасолі выкарыстоўваюць у смажаным, адварным і печаным выглядзе, а таксама як кампанент многіх страў. Акрамя таго, іх можна кансерваваць у марынадзе ці таматным соку.

Яны ўтрымліваюць вялікую колькасць калію, што вельмі каштоўна для людзей, якія пакутуюць на захворванні сэрца і нырак.

## ПРАТЭРМІНАВАНЫЯ ЛЕКІ — ДЛЯ САДУ І АГАРОДА

Ад нематоды дапамогуць пазбавіцца лекі супраць гельмінтаў (растаўчыце дзве-тры таблеткі і растварыце ў 10 л вады). Паліце гэтым растворам заражаныя пасадкі, і шкоднікі хутка загінуць. Гэтыя ж таблеткі дапамогуць у барацьбе з капуснай мухай: двух-трох палівaў будзе дастаткова.

Са злоснай фітафторай і бурай плямістасцю вам дапамогуць змагацца антыбіётыкі: трыхапол, ампіцылін і эрытраміцін. Растварыце дзве—чатыры таблеткі ў вядры вады і апырскайце пасадкі.

Ну а **бурштынавая кіслата** заўсёды павінна быць у аптэчцы сапраўднага агародніка. Плюсаў у яе процьма: умацоўвае імунітэт раслін, узмацняе іх рост і развіццё, абясшкоджвае яды, стымулюе прарастанне насення. Апырскайце 0,01-працэнтным растворам (10 г на 10 л вады) бурштынавай кіслаты бульбяныя пасадкі. Гэтая мера будзе не толькі выдатнай прафілактыкай супраць фітафтарозу, але і дапаможа павялічыць ураджай амаль на 50 кг з соткі. Апырсквайце пасадкі раз на тыдзень. Расход на адну сотку — 2 л.

# ЧАРОЎНЫЯ РЭКІ БЕЛАРУСІ



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1.** Збудаванне праз раку, канал; у беларускіх паданнях ... для сваіх сходак часта выбірае нячыстая сіла. **8.** Адно з імёнаў прарока Ільі, распарадчыка дажджоў і навальніц, дзень якога адзначаецца 2 жніўня. **9.** «Беражніца, багіня азёраў\\У прыдонні густой цішы\\Пахавай назаўсёды ...» З верша Р.Малахоўскага «Беражніца». **10.** Старажытнабеларуская багіня крыніц і жыцця; лічылася, што яна адрадзіла жыццё пасля сусветнага патопу. **12.** Міфічныя насельніцы возера Свіцязь; паводле легенды, у іх ператварыліся жанчыны некалі існаваўшага горада, на месцы якога ўзнікла возера. **15.** Азёрны або лiманны іл як лекавы сродак. **16.** «Як вокам мыслі азіраю\\Цябе, мой луг і бераг родны,\\Дзе льецца ... срэбраводны». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Леснікова пасада»). **17.** Старажытны італьянскі бог, дэман лугоў, палёў і статкаў. **18.** Статуя, якой нашы продкі пакланяліся як бажаству. **19.** Не ..., а шыла з перцам (прык.). **20.** Стыль спартыўнага плавання. **21.** Зімні ... глыбокі, летам хлеб высокі (прык.). **23.** «Жартуюць: рэчку Іпуць\\З пахмелля можна выпіць.\\А ёй турботы мала,\\Рачулачка — ...». З верша А. Грачанікава «Іпуць». **24.** Цыркавы артыст-комік. **27.** Куды ..., туды і дым (прык.). **29.** Адтуліна, зробленая геолагамі. **32.** Залатое ... . Тое, дзеля чаго, паводле грэчаскай легенды, арганаўты здзейснілі марское падарожжа з Грэцыі ў Калхіду. **33.** Паглыбленне ў сцяне. **34.** Дняпро і ... . Рэкі на Беларусі, якія, паводле легенды, пацяклі па слядах сабак Стаўры і Гаўры. **35.** «За зялёным лесам ..., і Цна, і Бобрык\\Слухаюць прыбліжаны рып старых вазоў». З верша В.Гардзея «Да рачулак едуць на вазах рыпучых».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 2.** Прыйшоў ... — усяму час (прык.). **3.** Мужчынскае імя. **4.** Возера ў Крупскім раёне і рыба сямейства ласосепадобных. **5.** Рака, левы прыток Дняпра. **6.** Пачварны балотны нячысцік, які, па павер'ях, уяўляўся таўстуном, аблепленым пластамі гразі. **7.** Густы непраходны лясны балоцісты зараснік у паўднёвых краінах. **11.** Вечназялёная паўднёвая расліна сямейства лілейных. **13.** Збудаванне з помпамі для падачы вады. **14.** Рачныя дзеўкі, душы тапельніц; паводле павер'яў, таго, хто наблізіцца да іх, яны заманьваюць у карагод, а потым у раку, у самы вір. **20.** Беларуская багіня сялянства; па павер'ях, яна прымала выяву качкі і плавала паміж берагамі ракі, як бы звязвала зямлю і ваду. Яе дзень беларусы адзначалі 15 ліпеня. **22.** Старажытнагрэчаскі гісторык, імя якога насіла мора, што некалі існавала на месцы Прыпяцкай нізіны. **25.** ... або карабель; паводле міфа, ... лічылася непатапляльнай, калі ў ёй знаходзіліся героі-продкі або святыя. **26.** Што край, то абычай, што старана, то ... (прык.). **28.** ... салдаты — не войска, ... дубы — не дуброва (прык.). **30.** Веялка. **31.** «Чароўныя рэкі!\\Іх назвы звіняць і шумяць у вушах:\\І Проня, і Гайна, і Ольса,\\І Бобр, і Уса, і ...». З верша П. Панчанкі «Бярэзінскі запаведнік».

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г.Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** 1. Мост. 8. Галляш. 9. Гора. 10. Жыва. 12. Світязнікі. 15. Гразі. 16. Нёман. 17. Фаўн. 18. Ідал. 19. Язык. 20. Брас. 21. Снег. 23. Рака. 24. Клоун. 27. Вецер. 29. Свідравіна. 32. Руно. 33. Ніша. 34. Дзвіна. 35. Лань. **Па вертыкалі:** 2. Спас. 3. Марцін. 4. Сялява. 5. Сож. 6. Балотнік. 7. Джунглі. 11. Юка. 13. Вадакачка. 14. Вадзяніцы. 20. Берагіня. 22. Герадот. 25. Ладдзя. 26. Навіна. 28. Два. 30. Арфа. 31. Уша.

Даты | Падзеі | Людзі

### 10 ЖНІЎНЯ

**1787** год — нарадзіўся Ігнат Мікалаевіч Даніловіч, гісторык і прававед, прафесар. Адзін з першых даследчыкаў летапісных і заканадаўчых помнікаў Беларусі і Літвы. З 1814 года выкладаў права ва ўніверсітэтах Вільні, Харкава, Кіева, Масквы. У 1830-1835 гадах працаваў у Пецярбургу ў камісіі Міхаіла Сперанскага па падрыхтоўцы збору законаў для заходніх губерняў Расійскай імперыі. Упершыню апісаў усе рукапісныя і друкаваныя асобнікі Статута ВКЛ, падрыхтаваў першае навуковае выданне Статута ВКЛ 1529 года. Апісаў, перадаў змест і часткова апублікаваў 2500 розных пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і Літвы. Памёр у 1843 годзе.



**1796** год — у вёсцы Малая Капліца пад Гроднам нарадзіўся Ігнат Легатовіч, паэт, педагог. У 1817-1839 гадах выкладаў латынь і літаратуру ў Мінскай гімназіі. Сябраваў з Вінцэнтам Дунінам-Марцінкевічам. Асноўныя жанры творчасці — дыдактычныя двухрадкоўі-максімы, эпіграмы. Найбольш вядомая рэзка антыпрыгонніцкая эпіграма «Скажы, вяльможны пане», за публікацыю якой быў канфіскаваны віленскі альманах «Баян». Пісаў павучальныя кнігі для дзяцей і юнацтва.

**1878** год — нарадзіўся Міровіч (сапр. Дунаеў) Еўсцігней Афінагенавіч, беларускі рэжысёр, драматург і педагог, адзін з заснавальнікаў беларускага сучаснага тэатра, народны артыст Беларусі, прафесар.

**1896** год — 120 гадоў таму нарадзіўся Даніла Фёдаравіч Сердзіч, ваенны дзеяч, камдыў, герой Грамадзянскай вайны. У гады 1-й сусветнай вайны служыў у паўднёваславянскім добраахвотніцкім корпусе рускай арміі. За ўдзел у ліпеньскай дэманстрацыі 1917 года ў Петраградзе арыштаваны і пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі — камандзір атрада Чырвонай гвардыі, удзельнік штурму Зімовага палаца. З 1932 года камандаваў 4-м, у 1935-1937 — 3-м кавалерыйскім корпусам у Беларускай ваеннай акрузе. Памёр у 1937 годзе. Імем Сердзіча названая вуліца ў Мінску.

**1906** год — дата нараджэння Вадзіма Сіняўскага, журналіста, каментатара Усесаюзнага радыё, заснавальніка савецкай школы спартыўнага рэпартажу.

Было сказана

**Ніна ЗАГОРСКАЯ, паэтэса:**
*«Песня не ведае скону і тлену. Дзедава песня — эпохі арган».*

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.39 | 20.49 | 15.10 |
| Віцебск — | 5.24 | 20.43 | 15.19 |
| Магілёў — | 5.29 | 20.39 | 15.10 |
| Гомель — | 5.32 | 20.30 | 14.58 |
| Гродна — | 5.55 | 21.04 | 15.09 |
| Брэст — | 6.01 | 20.59 | 14.58 |

### Месяц

*Першая квадра 10.08—17.08. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

***Пр.** Алены, Анастасіі, Васілія, Івана.*
***К.** Багдана, Барыса.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +17..+19°C | КІЕЎ +27..+29°C | РЫГА +16..+18°C |
| ВІЛЬНЮС +17..+19°C | МАСКВА +25..+27°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +16..+18°C |

## УСМІХНЕМСЯ

**Дай чалавеку рыбу, і ён будзе сыты адзін дзень, навучы яго лавіць рыбу, і ён будзе кожны выхадны вяртацца п'яны з трыма карасямі.**

Два студэнты перад экзаменам сядзяць на лаўцы. Адзін з іх самаўпэўнена заяўляе таварышу:

— Праз некалькі гадоў людзі будуць казаць, паглядзеўшы на будынак нашага інстытута: тут вучыўся студэнт Кукушкін!

Дэкан, які праходзіць міма, пачуўшы такую заяву, заўважае:

— Калі не здасі экзамены, то людзі будуць так казаць ужо на наступным тыдні!

**Калі ты не падабаешся САБЕ, схадзі на пляж, паглядзі на ІНШЫХ, і ты зразумееш — якая ты ПРЫГОЖАЯ!**

Прыняўшы 150 гарэлачкі, мужык настроіўся на секс.

...Потым дапіў бутэльку — настройкі збіліся і вырубіліся.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3212.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| М | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| П | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |

Нумар падпісаны ў 19.30 9 жніўня 2016 года.